ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 8 (928) | ЧАЦВЕР, 15 мая 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Да вынікаў суботніка

## НАШ УКЛАД У АГУЛЬНУЮ СПРАВУ

Яшчэ за тыдзень да рэспубліканскага суботніка, які праводзіўся ў краіне 19 красавіка, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі нашага універсітэта ўключыліся ў работу па добраўпарадкаванню, азеляненню і навядзенню санітарнага парадку на замацаванай за ГДУ тэрыторыі, у вучэбных карпусах і інтэрнатах, гаспадарчых збудаваннях. Але найбольш плённым стала само свята працы. У гэты дзень быў выкананы вялікі аб'ём работы. Найбольш вызначыліся калектывы эканамічнага /нам. дэкана П.П.Саковіч/, фізічнага /дэкан С.В.Шалупаеў/, біялагічнага /дэкан С.Ф.Алешка/, геолага-геаграфічнага /нам. дэкана Ю.П.Іваноў/ факультэтаў.

Некаторыя работы па добраўпарадкаванню былі завершаны пасля 19 красавіка.

Усяго ў лік суботніка адпрацавала 1116 выкладчыкаў і супрацоўнікаў, 4265 студэнтаў і 10 пенсіянераў. На будаўніцтва радыялагічнага дыспансера ў Гомелі універсітэтам пералічана 50 млн. рублёў.

Для далейшага падтрымання належнага парадку на тэрыторыі і ў вучэбна-лабараторных карпусах устаноўлены адзіны санітарны дзень -- чацвер кожнага месяца.

## НАЗАЎСЁДЫ Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

*У калектыве нашага універсітэта, як і ва ўсёй краіне, урачыста адзначана 52-я гадавіна Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гэтай даце 7-га мая быў прысвечаны традыцыйны "Агеньчык" ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл. Яго ўдзельнікі ўсклалі вянок на брацкую магілу ў студэнцкім парку пасля кароткага выступлення старшыні універсітэцкай арганізацыі ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл палкоўніка ў адстаўцы А.А.Косцікава і мінутай маўчання ўшанавалі памяць загінуўшых патрыётаў.*

*У гонар свята ветэранам вайны і Узброеных Сіл універсітэтам аказана матэрыяльная дапамога.*

## ПА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТЭМАТЫЦЫ



На спецыялізаваным Савеце пры нашым універсітэце адбылася другая па ліку абарона кандыдацкай дысертацыі па беларускай мове. На гэты раз адказны экзамен трымала старшая выкладчыца кафедры беларускай мовы Н.А.Багамольнікава /навуковы кіраўнік -- доктар філалагічных навук, прафесар названай кафедры У.В.Анічэнка/. Тэма яе дысертацыі -- "Гідранімія басейна ракі Прыпяць у межах Гомельшчыны".

Актуальнасць даследавання Н.А.Багамольнікавай вызначана крайняй неабходнасцю комплекснага вывучэння гідранімії Усходняга Палесся, значная частка якога пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Большасць насельніцтва двух раёнаў гэтай зоны /Нараўлянскі, Хойніцкі/ перасяліліся на новыя месцы жыхарства. Такая сітуацыя пагражае знікненню з памяці людзей даўніх уласных назваў роднага краю.

Каб такога не здарылася, дысертантка на працягу сямі гадоў вяла карпатлівую плённую працу і паспяхова справілася з пастаўленай перад сабой задачай. На своечасовасць і каштоўнасць яе даследавання ў сваіх водзывах указалі афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук прафесар БДУ В.П.Лемцюгова і кандыдат філалагічных навук дацэнт Віцебскага дзяржуніверсітэта Л.І.Злобін, а таксама апаніруючая навучальная ўстанова -- Брэсцкі дзяржуніверсітэт.

Н.А.Багамольнікава абараняла дысертацыю і адказвала на пытанні з глыбокім веданнем прааналізаванага матэрыялу. Члены спецыялізаванага Савета былі аднадушнымі: прагаласавалі за прысуджэнне Наталлі Аляксееўне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

**Б.ВАЛОДЗІН.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

Да ўвагі студэнтаў

## ЖАДАЕЦЕ ЛЕТАМ ПРАЦАВАЦЬ?

Студэнцкія будаўнічыя атрады, якія былі вельмі папулярнымі ў мінулыя гады, зараз успамінаюцца зноткамі лёгкага суму і жалю, што гэтая добрая справа з-за развалу СССР і эканамічных цяжкасцей у краіне прыйшла ў заняпад. Многім юнакам і дзяўчатам удзел у СБА даваў як маральную, фізічную загартоўку, так і прыносіў неблагую матэрыяльную падтрымку.

Пакрысе добрую традыцыю спрабуюць аднавіць. Так, у нашым універсітэце пачынаецца фарміраванне атрада студэнтаў для работы гэтым летам у Стаўрапольскім краі. У саўгасе "Ізабільны" будуць чакаць юнакоў і дзяўчат на дапамогу ў прапалцы і ўборцы гароднiны. Тэрміны работы -- з 18 ліпеня па 10 верасня.

Жадаючыя летам адправіцца на Стаўрапольшчыну могуць звяртацца за даведкамі ў прафком студэнтаў ГДУ /гал. корпус, п. 1-17, тэл. 57-16-11/.

З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ГДУ дацэнт кафедры эканамічных тэорый **ПУХАВА Наталля Паўлаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі і супрацоўнікі фізічнага факультэта, калектывы кафедр агульнай фізікі і радыёфізікі горача віншуюць старшага навуковага супрацоўніка **САМУСЕНКУ Аляксандра Іванавіча** з паспяховай абаронай дысертацыі ў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.*

*29-га красавіка адбыліся прафсаюзныя канферэнцыі супрацоўнікаў і студэнтаў ГДУ*

## ВЫРАТУЕ ТОЛЬКІ АКТЫЎНАСЦЬ

Прафсаюзная арганізацыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта налічвае 1116 членаў. Кожны дзясяты з іх на справаздачна-выбарных прафсаюзных сходах факультэтаў і прафгруп быў абраны на агульнауніверсітэцкую канферэнцыю. У яе рабоце ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі рэктарата, дэканы факультэтаў і іх намеснікі, загадчыкі кафедр, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

Са справаздачай аб дзейнасці прафкома за два з паловай гады выступіў яго старшыня Г.І.Варатніцкі. Напачатку Георгій Іванавіч гаварыў аб тых адказных задачах, якія цяпер стаяць перад прафсаюзам па сацыяльнай абароне сваіх членаў ва ўмовах цяжкага эканамічнага становішча ў нашай краіне. Затым ён усебакова прааналізаваў як працуе ў гэтым напрамку прафком і яго пастаянна дзеючыя камісіі, якія на іх пасяджэннях разглядаліся пытанні і як выконваліся прымаемыя рашэнні. Адзначана, што асноўная ўвага ўдзялялася паляпшэнню ўмоў працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў, аздараўленню іх саміх і іх дзяцей, умацаванню працоўнай дысцыпліны і іншым пытанням, ад вырашэння якіх залежыць мікраклімат у калектыве, нашы агульныя дасягненні.

Старшыня прафкома ўказаў і на тыя недахопы і праблемы, якія мелі месца ў рабоце прафкома, на шляхі іх ухілення.

Справаздачу аб фінансавай дзейнасці прафкома зрабіў старшыня рэвізійнай камісіі І.К.Кекіш.

Пры абмеркаванні заслуханых справаздач выступілі старшыні пастаянных камісій прафкома: па ахове працы і тэхніцы бяспекі -- У.С.Стрыжнёў, культурна-масавай -- В.В.Лісоўскі, рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў, начальнік планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук, галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя С.А.Залатых.

Дэлегаты канферэнцыі прызналі работу прафкома за прамежкавы перыяд яго дзейнасці здавальняючай, а таксама зацвердзілі справаздачу рэвізійнай камісіі. Па абмеркаваных пытаннях прынята адпаведная пастанова. У адным з яе пунктаў адобраны Статут па стварэнню Саюза паміж Беларуссю і Расіяй.

У рабоце канферэнцыі прыняла ўдзел і выступіла намеснік старшыні абкома прафсаюза адукацыі і навукі Н.І.Аліфірэнка.

## У КЛОПАТАХ АБ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАХ

Вядома, што прафсаюзы сёння -- гэта адна з самых масавых арганізацый, якая абавязана абараняць інтарэсы сваіх членаў у грамадстве. Як выконвае гэты свой галоўны абавязак прафком студэнтаў ГДУ і ішла размова на чарговай XIV справаздачнай канферэнцыі. Са справаздачай на ёй выступіла старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава.

У структуры прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў універсітэта -- 4288 членаў прафсаюза. Прафком праяўляе клопаты аб іх матэрыяльным становішчы, стварэнні здаровых і бяспечных умоў вучобы і быту, лячэнні і аздараўленні, арганізацыі карыснага культурнага адпачынку. Так, да асноўнага "даходу" студэнта -- стыпендыі прафсаюз можа дадаткова за добрыя поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці назначаць імянныя стыпендыі: прафкома студэнтаў, і па яго рэкамендацыі ўстанаўліваюцца таксама стыпендыі абласным камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

За справаздачны перыяд прафком студэнтаў разам з прафбюро факультэтаў сістэматычна праводзіў работу па вывучэнню матэрыяльнага становішча студэнтаў і аказанню практычнай дапамогі малазабяспечаным студэнтам, студэнцкім сем'ям. Вялася сумесная работа з медпунктам універсітэта па аналізу захворваемасці студэнтаў па факультэтах, ажыццяўляўся ўлік тых, хто мае патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні, у аздараўленні ва ўмовах санаторыя-прафілакторыя ГДУ.

Узаемаадносіны з рэктаратам вызначаліся ўмовамі заключанага з ім пагаднення па сацыяльна-эканамічных пытаннях, мэтай якога з'яўлялася замацаванне нарматыўна правоў і абавязкаў студэнцкага калектыву ў цэлым і асобных яго членаў, прафсаюзных арганізацый у сферы вучобы, быту і адпачынку.

Дакладчыка дапоўнілі выступіўшыя на справаздачнай канферэнцыі галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя ГДУ С.А.Залатых, студэнты А.Якушэнка (філфак), Ю.Камароў (гісторыка-юрыдычны факультэт), Ю.Марчанка (факультэт фізічнай культуры), старшыня студсавета інтэрната N1 А.Хадановіч, старшыня культурна-масавай камісіі прафкома Ж.Біран.

Работа прафкома студэнтаў за справаздачны перыяд была прызнана на канферэнцыі здавальняючай, дэлегаты зацвердзілі справаздачу рэвізійнай камісіі прафкома, з якой выступіла яе старшыня студэнтка фізічнага факультэта Л.Сарока. Канферэнцыя прыняла адпаведную рэзалюцыю.

На канферэнцыі выступілі старшыня абкома прафсаюза адукацыі і навукі У.Я.Курылаў, першы прарэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін.

## АКАДЭМІЯ НАВУК АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

Акадэмія навук Беларусі аб"яўляе конкурс на прэміі Акадэміі навук Беларусі за лепшую навуковую работу ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных навук.

У 1997 годзе будзе прысуджана 24 прэміі:

12 -- для сталых вучоных, памерам 50 мінімальных зарплат;

6 -- для маладых (да 34 год) вучоных, памерам 30 мінімальных зарплат;

6 -- для студэнтаў, памерам 20 мінімальных зарплат.

На конкурс могуць быць прадстаўлены: манаграфіі, артыкулы, цыклы артыкулаў, звязаныя адной тэмай, надрукаваныя ў вядучых навуковых часопісах. Студэнты могуць прадставіць свае даследаванні ў выглядзе рукапісаў.

Для прадстаўлення работ на конкурс патрэбны:

1. рэкамендацыя сапраўднага члена або члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларусі, ці рашэнне вучонага савета навуковай установы або факультэта навучальнай установы Рэспублікі Беларусь;

2. анатацыя, якая характарызуе работу, яе значэнне, аб"ёмам не больш трох старонак, падпісаная аўтарамі;

3. кароткая анатацыя (да 500-600 знакаў, на беларускай мове);

4. творчая аўтабіяграфія саіскальнікаў;

5. звесткі аб аўтарах з указаннем тэлефонаў і адрасоў (службовых і хатніх).

Работы на конкурс прымаюцца да 1 кастрычніка.

Работы дасылаць на адрас: 220072, Мінск, прасп.Ф.Скарыны, 66, Прэзідыум АН Беларусі, сакратару Камісіі па прэміях В.А.Карэлінай.



*Дні філолага*

## ЦІКАВА І ЗАПАМІНАЛЬНА

***Вясна -- час абуджэння не толькі прыроды ад зімовага сну, але і студэнцтва – ад аднастайнасці вучэбных будняў, іх размеранай плыні. Душа просіць свабоды, волі, прастору. І гэта жаданне можна ажыццявіць пры падрыхтоўцы і правядзенні цікавых і запамінальных "Дзён факультэта". Яны прайшлі ўжо на многіх факультэтах універсітэта. Аб днях біяфака мы расказвалі на старонках нашай газеты, а сёння эстафету прымаюць будучыя філолагі.***

У дні філалагічнага факультэта кафедры праводзілі выніковыя пасяджэнні XXVI студэнцкай навуковай канферэнцыі. Студэнты выступалі з дакладамі, паведамленнямі па праблемах развіцця мовазнаўства, літаратуразнаўства, фальклору. Лепшыя работы рэкамендаваны на рэспубліканскі конкурс.

Адбылася творчая сустрэча з фальклорным гуртом "Карагод" пад кіраўніцтвам Вольгі Анатольеўны Драмук. У яго выкананні гледачы пабачылі абрадавае відовішча пад назвай "Купалле". Гэта ўжо не першае выступленне названага калектыву ў сценах нашага універсітэта. Яно не расчаравала, а ў чарговы раз паказала, наколькі цікавымі і прыгожымі могуць быць беларускія народныя танцы і песні. Спадзяёмся, што гэта была не апошняя сустрэча з імі.

На працягу тыдня арганізацыйны камітэт /Наталля Валошына, Святлана Талкачова, Аляксандр Якушэнка, аўтар гэтых радкоў/ праводзілі розныя мерапрыемствы: кулінарны конкурс, конкурсную выставу "Сваімі рукамі", конкурсы на лепшую газету і на лепшага выкладчыка на факультэце.

Адбыўся таксама факультэцкі канцэрт, на якім былі ўзноўлены танцавальныя і песенныя кампазіцыі, вядомыя ўжо ўсім па конкурсе " Ану, першакурснік!", уключаны новыя нумары. Запамінальным момантам канцэрта стала "Беларуская старонка", у якой прагучалі песні на беларускай мове ў выкананні выкладчыка кафедры беларускай культуры С.У.Вінаградава.

Нечаканым і цікавым для гледачоў было выступленне кітайскага студэнта III курса групы Р-31 Лі Міня з песняй на кітайскай мове без музычнага суправаджэння.

Вельмі спадабаўся ўсім кулінарны конкурс, незвычайным момантам якога стаў падарунак кітайскіх студэнтаў з групы Р-31. Яны падрыхтавалі сваю нацыянальную страву, расказалі цікавую легенду пра яе паходжанне. Спецыфічны смак гэтага падарунка ацанілі многія жадаючыя і, разам з тым, мелі магчымасць папрактыкавацца ў выкарыстанні кітайскіх палачак для ежы. Але ўсё ж перавагу аддалі відэльцам і рукам. Што датычыцца кулінарнага конкурсу, то, нягледзячы на невялікую колькасць прадстаўленых на ім салодкіх вырабаў, іх сапраўды можна было назваць кулінарнымі шэдэўрамі. Смак тортаў "Жыве Беларусь!" /Ірына Кандраценка, гр. БА-34/ і "Лістапад" /Наталля Лобах, Таццяна Вострыкава, Ганна Гуляева, гр. Р-11/ надоўга запамятаецца тым, хто іх пакаштаваў.

Шмат прыгожага можна было пабачыць і на конкурснай выставе "Сваімі рукамі": вышыўкі, мяккія цацкі, малюнкі, карціны, сурвэткі. Але хацелася б адзначыць карціны "Адзінота", "На рэчцы", "Беражанкі" Людмілы Лявіцкай /гр.Н-14/, пано Марыі Адзінцовай /гр. Р-11/, упрыгожанні Ганны Дунаевай /гр.РБ-13/.

У конкурсе на лепшую газету прымалі ўдзел першакурснікі. Больш за ўсіх спадабалася газета групы БА-13, якой і аддалі I месца. Яе змест, паэтычныя прысвячэнні, прыгажосць і акуратнасць малюнкаў не маглі не паўплываць на думку журы. Вельмі ўдзячны групам Р-11, Р-12, Б-11, Б-12, А-15, Н-14 за цікавыя і маляўнічыя, сур'ёзныя і гумарыстычныя газеты!

"Дні факультэта" -- гэта ўсё ж свята для нас, студэнтаў. Дык давайце будзем не забываць пра гэта і прымаць у іх больш актыўны ўдзел.

**Наталля ШАНЬГІНА, студэнтка IV курса філалагічнага факультэта.**

*З семінара псіхолагаў*

## ШУКАЦЬ ПАЗІТЫЎ У ЖЫЦЦІ

Гомельскім аддзяленнем Беларускай асацыяцыі псіхалогіі здароўя быў арганізаваны і праведзены гарадскі семінар псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў і псіхіятраў. Гэта першае мерапрыемства такога характару ў нашым горадзе. Нам, студэнтам ГДУ, якія атрымліваюць дадатковую спецыялізацыю па псіхалогіі, пашчасціла прымаць удзел у яго рабоце. Семінар стаў сапраўды яркай падзеяй культурнага і навуковага жыцця г.Гомеля. Там было шмат цікавых людзей, займальных выступленняў розных па сваёй тэматыцы. І ўсё гэта ўсхвалявала нас, пакінула шмат прыемных уражанняў.

Людміла Гарадзецкая -- старшыня Гомельскага аддзялення Беларускай асацыяцыі псіхалогіі здароўя -- адкрыла работу семінара словамі Бернарда Шоу, сэнс якіх такі: калі сустракаюцца два чалавекі і ў кожнага ў кішэні ёсць па яблыку, калі яны імі абмяняюцца, то ў кішэні застанецца ляжаць адзін яблык; калі ж сустракаюцца два чалавекі і ў іх ёсць па адной ідэі, то пасля абмену ў кожнага ўжо будзе па дзве ідэі. Іменна гэта аб"яднала ўсіх удзельнікаў семінара.

Агульнай тэматыкай семінара была пазітыўная псіхатэрапія. Ды і назва гаворыць сама за сябе: "Казкі, прытчы, анекдоты ў псіхатэрапіі". Вячаслаў Бортнік у сваім выступленні, прысвечаным філасофскім прытчам Сіло, прапанаваў задумацца аб жыцці, аб дробязях, якім мы часам не ўдзяляем належнай ўвагі. На гумарыстычны лад настроіла работа Алены Кіданавай па матэрыялах кнігі Л.Малерба "Башкавітыя курыцы". У невялікіх анекдатычных гісторыях, галоўнымі героямі якіх з"яўляюцца ўсім добра знаёмыя куры, тонка адлюстраваны асаблівасці чалавечых узаемаадносін. Гэты настрой падтрымала Алеся Кучарава сваім выступленнем "Псіхатэрапеўтычная метафара ў беларускім фальклоры". Яна паказала як у казках, прымаўках і прыказках ярка апісваецца характар адносін паміж мужам і жонкай і як казачныя героі знаходзяць выйсце з канфліктных сітуацый. Нам вельмі спадабалася гэта выступленне, яно было насычана канкрэтнымі прыкладамі і сітуацыямі. А галоўнае, мы змаглі самі пагаварыць, паспрачацца ў пошуках свайго выхаду з прапанаваных сітуацый.

Цікава было пачуць гісторыю Чайкі, якая носіць імя Джонатан Лівінгстон (па матывах казкі-прытчы Р.Баха). Гэтай тэмай на семінары Вольга Раўчанка закранула праблему, як асобе вырасці духоўна. Нас вельмі ўразіў відэапрагляд,

(ЗАКАНЧЭННЕ на 5-й стар.)

# НЕ ЗАРАСТАЮЦЬ СЦЕЖКІ-ДАРОЖКІ...

Нядаўна па запрашэнню Зальцбургскага універсітэта (Аўстрыя) я наведаў гэту вышэйшую навучальную ўстанову, каб дапамагчы аўстрыйскім прыхільнікам беларускай мовы глыбей распазнаць яе моўны ландшафт на міжславянскім фоне і функцыянальную ролю ў жыцці грамадства. Зальцбургскі універсітэт займае прэстыжнае месца ў папулярызацыі беларусістыкі сярод аўстрыйскіх славістаў-выкладчыкаў і студэнтаў. Ён вядзе свой адлік з 1622 г. на месцы былой гімназіі, заснаванай у 1617 г. Сёння ён налічвае 8 факультэтаў, дзе навучаюцца 12000 студэнтаў стацыянара з розных краін свету. Аўстрыйскія студэнты навучаюцца тут бясплатна, а замежныя -- на платнай аснове.

На гэтым фоне адным з прэстыжных і прызнаных сусветнай грамадскасцю з'яўляецца гуманітарны факультэт, у саставе якога студэнты вывучаюць такія спецыяльнасці як філасофія, сацыялогія, культура, публіцыстыка, выхаванне, лінгвістыка, класічная філалогія, англістыка і амерыканістыка, раманістыка, славістыка, класічная археалогія, мастацтвазнаўства, музыказнаўства, гісторыя, палітыка.

На гэтым факультэце створаны і плённа працуюць так званыя інстытуты (па-нашаму кафедры) па адпаведных галінах ведаў. Мяне найбольш зацікавіў і прывабіў Інстытут славістыкі, дзе вывучаюцца і даследуюцца славянскія мовы: балгарская, баснійская, чэшская, польская, сербская, славацкая, славенская, а таксама ўсходнеславянскія (руская, украінская, беларуская). Я імкнуўся высветліць сукупнасць умоў, у якіх адбываецца там вывучэнне беларускай мовы.

У Інстытуце славянскай філалогіі даўно працуе багатай душы аўстрыйскі славіст доктар навук Герман Бідар, які паспяхова абараніў сваю кандыдацкую дысертацыю на тэму "Літоўскі статут 1529 г. (Заўвагі па гістарычнай арфаграфіі і фанетыцы старабеларускай юрыдычнай мовы)". Акрамя нямецкай мовы, ён валодае рускай, беларускай, украінскай і польскай мовамі. Ён неаднаразова наведваў Беларусь: быў удзельнікам Першага і Другога Міжнародных кангрэсаў беларусістаў у Мінску (1991, 1995 гг.), праводзіў трохтыднёвыя інтэнсіўныя заняткі па нямецкай мове для супрацоўнікаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1994 г.).

Герман Бідар часта прадстаўляў беларусістыку за межамі Беларусі: прымаў удзел у рабоце сімпозіума "Моўная і культурная палітыка Беларусі" (Інстытут славістыкі Зальцбургскага універсітэта, 1991), у розны час чытаў лекцыі па функцыяніраванню беларускай мовы ва універсітэтах Патсдама, Грайсфальда, Брно, Інсбрука. Яму часта даводзілася ўдзельнічаць у айчыннай канферэнцыі "Моўная палітыка ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе", дзе выступіў з дакладам



*Ягелонскі універсітэт*

"Моўная тэндэнцыя ў Беларусі (Венскі універсітэт, 1993), на VI з"ездзе нямецкіх славістаў "Сацыялінгвістычны аспект беларускай мовы" (Лейпцыг, 1994). На канферэнцыі ў Польшчы "Польшча і Усходняя Славія: культурнае сумежжа" ён прачытаў даклад "Тэндэнцыя развіцця норм беларускай літаратурнай мовы" (Ольштынская Вышэйшая педагагічная школа, 1995). Актуальным пытанням функцыянальнага развіцця нашай нарматыўнай мовы Герман Бідар прысвяціў свой даклад "Перспектывы беларускай стандартнай мовы" на канферэнцыі Інсбрукскага універсітэта (1995). Яго публікацыі па беларусазнаўству друкуюцца на старонках аўстрыйскіх, нямецкіх, чэхаславацкіх, польскіх і беларускіх выданняў.

Зацікаўленыя адносіны Германа Бідара да беларускай мовы знаходзяць сваё адлюстраванне і ў праграме заняткаў у Зальцбургскім універсітэце, дзе студэнты-славісты беларускую мову вывучаюць ў курсе супастаўляльнай і параўнальнай граматыкі славянскіх моў і на практычных занятках па яе засваенню.

Важным момантам у тэарэтычным засваенні беларускай мовы з"яўляецца дастатковая для далёкага замежжа ўкамплектаванасць інстытуцкай бібліятэкі неабходнай літаратурай па беларускай філалогіі, у тым ліку і па нашай мове.

Пра папулярызацыю беларускай мовы ў Аўстрыі сведчыць не толькі дзейнасць аўстрыйскіх беларусістаў, але і нашых беларускіх філолагаў. З лекцыямі па беларускай мове і літаратуры тут выступалі вядомыя вучоныя-беларусаведы Леў Шакун, Генадзь Цыхун, Алег Лойка, Уладзімір Сакалоўскі, Уладзімір Навумовіч.

Я быў жаданым госцем Зальцбургскага універсітэта з 7 па 14 красавіка. У адпаведнасці з маёй праграмай я пазнаёміў аўстрыйскіх студэнтаў-славістаў з беларускай мовай на славянскім моўным фоне. Сюды ўваходзіла асвятленне яе паходжання, функцыянальнага развіцця ў розныя гістарычныя перыяды, сувязей і ўзаемадзеяння з усходнеславянскімі і іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі і перспектыўнага нарматыўнага развіцця на народна-нацыянальнай моўнай аснове. У сваіх дыскусійных пытаннях студэнты цікавіліся выкананнем "Закона аб мовах у Беларускай ССР" (1990) і моўнай сітуацыяй, калі ў Беларусі пасля рэферэндуму сталі функцыяніраваць дзве дзяржаўныя мовы -- беларуская і руская. Студэнты хацелі ведаць, якая сёння колькасць беларускамоўных і рускамоўных школ ў Беларусі. Задаваліся таксама пытанні адносна лексічнага ўплыву неславянскіх моў (нямецкай і англійскай) на беларускую мову. Маёй рабочай мовай са студэнтамі была руская з перакладам на беларускую мову.

Мая культурная праграма была насычана экскурсіямі па Зальцбургу і навакольных жывапісных мясцінах, акаймаваных снежнымі вяршынямі Альпаў. На аўстрыйскіх курортах часта праводзяць свой вольны час не толькі аўстрыйцы, але і найбольш заможныя прадстаўнікі іншых еўрапейскіх краін. Штогод тут падарожнічае шмат турыстаў.

Незабыўнымі для мяне аказаліся сцежкі-дарожкі на аўстрыйскай зямлі, па якіх давялося прайсці ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў першы пасляваенны год. У маёй памяці ўваскрэслі перажытыя старонкі майго юнацкага жыцця. Тут, у Зальцбургу, мне давялося ўспомніць эпізод звыш 50-гадовай даўнасці, калі выпаў нялёгкі лёс аказацца ў перасыльным аўстрыйскім пункце Штрасгоф, размешчаным у 25 кіламетрах ад Вены. У мяне на сэрцы кошкі заскрэблі, як успомніў пра перажытыя ў Штрасгофе змардаваныя дні, як кармілі вязняў фашызму баландой з касцяной мукі і хлебам з драўляным пілавіннем. Мае аўстрыйскія калегі лічылі за лепшае не ўспамінаць тыя былыя часы.

Затое з задавальненнем я пабываў у Вене, там, дзе пасля Перамогі над Германіяй ў саставе гвардзейскага палка праходзіў службу ў дывізіённай газеце "Гвардзеец" у савецкай зоне аўстрыйскай сталіцы.

З Зальцбурга я прадоўжыў сваё падарожжа ў Кракаў, куды па запрашэнню Інстытута ўсходнеславянскай філалогіі Ягелонскага універсітэта быў запрошаны для ўдзелу ў юбілейнай навуковай сесіі, прысвечанай 70-годдзю прафесараў Рышарда Лужнага і Вяслава Віткоўскага. У гонар гэтай знамянальнай даты па даручэнню нашага універсітэта я абвясціў віншавальны адрас у гонар юбіляраў і ўручыў каштоўны падарунак. Прысутныя ў зале з прыемнасцю ўспрынялі радасную вестку пра Гомельскі дзяржаўны універсітэт, які носіць імя Францыска Скарыны, таго, хто ў далёкія ад нас часы крочыў з Полацка ў Кракаўскі універсітэт папоўніць свае веды, каб здзейсніліся яго прарочыя словы: "Книга есть мати всех добрых речей и учитель всякому доброму умению". Гэтым ганарыцца і Кракаўскі універсітэт, перад авальнай залай якога вісіць барэльеф беларускага першадрукара з яго запаветнымі словамі на польскай і беларускай мовах.

На юбілейнай навуковай сесіі я выступіў з апублікаваным у польскім зборніку "Усходнія славяне" дакладам "Вытокі сваяцкай тэрміналогіі беларускай мовы".

Мне было прыемна развітацца з Кракавам яшчэ і таму, што тэматыка майго даклада "Моўны ландшафт Беларусі на міжславянскім фоне" зацверджана і ўключана ў праграму XII Міжнароднага з"езду славістаў, які адбудзецца ў гэтым горадзе ў 1998 г. Спадзяюся быць яшчэ раз госцем Кракава і зноў прайсці па скарынаўскіх сцежках-дарожках.

**У.АНІЧЭНКА,**
**доктар філалагічных навук, прафесар.**



# ШУКАЦЬ ПАЗІТЫЎ У ЖЫЦЦІ

**(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 3-й стар.)**

які суправаджаў гэта выступленне. Урач-псіхіятр В.Філіпенка арганізаваў работу псіхатэрапеўтычнай майстэрні "Дух свабоды і адзіноты". Нават тое, што гэта праходзіла ў канцы семінара і ўсе крыху стаміліся, не перашкодзіла практычна кожнаму яго ўдзельніку з энтузіязмам прыняцца за работу.

Па-сапраўднаму цудоўнай разрадкай для ўсіх стала выступленне псіхалагічнага тэатра "ПИК" (ГДУ). На сцэне зіхацелі таленты, захапляючы нас жывым гумарыстычным дзействам на псіхалагічную тэму. Мы ад душы пасмяяліся за час выступлення рабят.

У перапынку можна было азнаёміцца з творчасцю гомельскіх мастакоў В.Казлова і Г.Тарскіх. Натхненне, якое ішло ад карцін, не толькі перадавалася ўсім, але і ўнесла сваю лепту ў агульную атмасферу адкрытасці, добразычлівасці і ўзаемаразумення. А атмасфера, якая склалася на семінары, сапраўды спрыяла ўсебаковаму абмену думкамі, вопытам, дыскусіі.

Мы вельмі ўдзячны арганізатарам семінара за прадстаўленую магчымасць творчай сустрэчы, што так важна для нашага прафесіянальнага росту і станаўлення. Асабліва мы хочам падзякаваць Галіну Віктараўну Гатальскую за бескарыслівую асветніцкую дзейнасць сярод студэнтаў, абласное ўпраўленне адукацыі, цэнтр псіхалагічнай дапамогі Савецкага раёна г.Гомеля за садзейнічанне ў арганізацыі семінара.

Нам хочацца верыць, што прайшоўшы семінар -- пачатак вялікай творчай сумеснай работы.

**Т.ГРАМЫКА, А.ШАБЛОЎСКІ, С.ДУДАЛЬ, С.РУЧУК, Н.ЛАЗЬКО, студэнты IV курса дадатковай спецыяльнасці "Практычная псіхалогія".**

*Да 200-годдзя парка імя М.В.Луначарскага*

# ЦУДОЎНАЯ МЯСЦІНА ГОМЕЛЯ

Гарадскія сады і паркі... Лепшае ўпрыгожанне, неад"емная рыса выгляду вялікіх і малых гарадоў Беларусі. Сярод іх Гомель на працягу дзесяцігоддзяў вылучаўся найбольш пышным зялёным убраннем.

Так, напрыклад, па даных на 1904 г., плошча садоў у горадзе раўнялася 11300 кв. сажняў, працягласць бульвараў і вуліц, на якіх раслі дрэвы, была 8,5 вёрстаў. Нягледзячы на тое, што гэта складала толькі 2,4% ад іх агульнай працягласці, названыя паказчыкі значна перавышалі аналагічныя па іншых павятовых гарадах Магілёўскай губерні і Магілёву. У апошнім сады займалі 9500 кв.саж., а бульвары і вуліцы з зелянінай -- толькі 3,5 вёрстаў. Па звестках на 1910 г. у Гомелі, як і ў Магілёве, мелася 3 гарадскія сады (акрамя іх былі яшчэ і прыватныя). Іх працягласць складала 12,4 вёрстаў. У большасці павятовых гарадоў гэтыя лічбы былі значна ніжэйшымі.

У 1911 г. сучаснікі адзначалі, што Гомель можа пахваліцца багаццем зеляніны: цудоўным паркам князя Паскевіча, чатырма грамадскімі і мноствам прыватных садоў, 40 вуліц горада былі абсаджаны дрэвамі. Гомель акаляў вялікі зялёны пояс. Навакольныя лясы, як і прыгожыя мясціны каля ракі, выкарыстоўваліся для адпачынку, асабліва ў летні перыяд.

Аднак галоўнай гордасцю гамяльчан заўсёды з"яўляўся парк над Сожам. "Такого великолепия и богатства, особенно по отношению к садам и паркам, в имении частного человека нет в целой Белоруссии, да немного подобных и в целой России" -- паведамлялася ў кнізе "Живописная Россия" (1882 г.). Па апісанні парку пачатку XX ст. вядома, што па галоўных алеях расстаўляліся статуі старажытных класікаў, усюды можна было ўбачыць клумбы, кветкі, аранжарэі. Сярод магутных дрэваў раскінуліся альтанкі, гроты, масткі. У стаўку плавалі лебедзі. Аднак у парк пускалі наведвальнікаў толькі з 1 мая да 1 верасня па нядзелях і чацвяргах, а ўваход быў платным.



*Парк культуры і адпачынку. Палац піянераў.*

Жыхары Гомеля бавілі вольны час і ў іншых зялёных кутках. Адным з месцаў гулянняў гамяльчан доўгі час заставаўся сквер. Вабіў да сябе шматлікую публіку і гарадскі бульвар. "Центральное положение его, обширность, тенистость, чистота, обилие удобных скамеек, цветники, фонтан, освещение и пр. -- делают его любимым местом гулянья и отдыха для многочисленного населения, как и -- веселья, игр и резвости для детей" -- паведамлялася ў газеце "Гомельская копейка" (1911 г.). Сад Вольна-Пажарнага таварыства, па апісанні рэпарцёра газеты "Полесская мысль" (1909 г.), таксама быў "обширный, простора много, красивые аллеи, беседки, уголки -- дивное место для отдыха и гулянья. Содержится сад не по-гомельски: опрятно, чисто, всюду видна заботливость. Там и музыка -- оркестр музыкально-драматического общества".

...Прайшлі дзесяцігоддзі. Час моцна змяніў вонкавы выгляд нашага горада. Ваеннае ліхалецце не пашкадавала і стары парк. Знікла частка рэдкіх дрэваў, пацярпеў і палац над Сожам. Аднак, адноўлены клопатамі гамяльчан, парк зноў пачаў вабіць да сябе і старых, і маладых. Тут прагульваліся па алеях і чыталі, наведвалі зімовы сад і атракцыёны, прысутнічалі на выступленнях знакамітых музычных калектываў. У большасці з нас звязаны са старым паркам свае ўспаміны -- дзіцячыя, юнацкія, радасныя або крышачку сумныя, як доўгія цені ад старых велізарных дрэваў на яго алеях. На нашых вачах парк часткова змяняў сваё аблічча: так знік кіёск каля цэнтральнага ўвахода, у сувязі з будаўніцтвам кінатэатра быў знесены будынак шахматна-шашачнага клуба, спыніў сваё існаванне фантан перад палацам. Тым не менш не змянілася галоўнае -- душа старога парку, таму і цягне гамяльчан да гэтага месца зноў і зноў.



*Парк культуры і адпачынку. Лебядзіны домік.*

**А.ЯШЧАНКА,**
**асістэнт кафедры гісторыі Беларусі.**
**Фота П.БЕЛАВУСА.**

СТУДЭНЦКАЯ ПРЭМ'ЕРА



# АЦЭНКУ ДАЎ АЎТАР

На сваёй чарговай прэм'еры ўдзельнікі універсітэцкага студэнцкага тэатра-студыі "Если бы..." хваляваліся, бадай, як ніколі дагэтуль. Яно і зразумела: на спектаклі "Шкірдзюкі займаюць абарону", які яны вынеслі на суд гледачоў, прысутнічаў сам аўтар п'есы гомельскі пісьменнік і драматург Васіль Ткачоў. І рэжысёр студэнцкага тэатра Генадзь Варонін, і самадзейныя акцёры адчувалі вялікую адказнасць перад ім за дакладнасць увасаблення ідэі твора на сцэне. А што гэта ім удалося ў поўнай меры, засведчыла рэакцыя В.Ткачова на ўбачанае:

-- Я проста ўражаны ігрой акцёраў-студэнтаў, якія не маюць ніякіх ганаровых званняў у тэатральным "табелі аб рангах". Я шчыра смяяўся як усе гледачы ў зале, прамакаў слёзы на вачах. Мае п'есы ставіліся на прафесійнай сцэне вобласці, рэспублікі, а гэтая камедыя ішла ў Мазырскім драмтэатры, для акцёраў якога я спецыяльна яе напісаў. І самадзейная студэнцкая моладзь справілася з пастаўленай задачай нікольні не горш за прафесіяналаў. Усім, хто працаваў над спектаклем, вялікі дзякуй!

Што можа быць даражэй для творчага чалавека за такую высокую ацэнку самога аўтара! Таму і настрой у акцёраў пасля спектакля быў адпаведны -- узрушаны, шчаслівы.

-- Над спектаклем мы працавалі крыху больш двух месяцаў, -- дадае рэжысёр Г.Варонін. -- Тэрмін даволі сціслы, каб падрыхтаваць як след і ролі, і касцюмы, і дэкарацыі. Справіліся з усім дзякуючы вялікаму працалюбству рабят і іх энтузіязму. А галоўнае таму, што ў нас добры калектыў. Гэта -- дваццаць аднадумцаў, адзін чалавек варты некалькіх: ён і з роляй справіцца, і можа быць добрым дэкаратарам, грымёрам... Чаму менавіта за гэту п'есу нашага земляка ўзяўся студэнцкі тэатр? Гумарыстычная тэма -- галоўная ў нашай творчасці. А гэта, на маю думку, выдатная камедыя, да таго ж напісаная на мясцовым матэрыяле, што нам блізка і зразумела.

...Дзеянне п'есы разгортваецца ў невялікай палескай вёсачцы Шкірдзюкі, якую не абмінула чарнобыльская бяда. Засталося тут пасля адсялення ў чыстыя раёны яе жыхароў толькі некалькі старых, бо ім шкада пакідаць гэтую "зямельку, якую радыя засыпала". Жывуць яны, адарваныя ад свету, цывілізацыі, сваімі надзённымі клопатамі. На камічнасці сітуацыі, якая ўзнікае тут пасля скажонага ўспрыняцця жыхаром Шкірдзюкоў дзедам Квачом / акцёр Андрэй Пацкоў/ інфармацыі па няспраўным радыё, і завязваюцца далейшыя падзеі ў спектаклі. Дзед рыхтуе бабіна войска ў складзе старой Каралíхі /Ганна Гуляева/, Мішуліхі /Наталля Дубіна/ і Кацярыны Вавёркі /Святлана Карчэўская/ да абароны Шкірдзюкоў ад немцаў, якія, нібыта, прыйшлі з вайной на нашу зямлю і ўжо захапілі суседнія раёны. Былы слаўны ваяка "мабілізуе" жанчын "капаць інжынерныя збудаванні -- акопы", каб не аддаць ворагу родны куточак. Узбраенне вядзецца не на жарт -- у вёсцы аказваецца гармата з музея, якой потым збіваецца не ваенны варожы самалёт, а самалёт з гуманітарнай дапамогай з Германіі.



Смех у глядзельнай зале ў час спектакля выклікаўся як камічнымі паводзінамі яго герояў, так і бліскучым выкананнем студэнтамі сваіх роляў: ужо названымі вышэй акцёрамі, а таксама Юрыем Рэзнікавым, Алегам Шабаліным, Дзмітрыем Жыхаравым. Але больш за ўсё апладысментаў дасталося Святлане Карчэўскай. Яе баба Вавёрка, па прызнанню аўтара В.Ткачова, атрымалася менавіта такой, якой ён задумваў у сваёй п'есе.

Заслужана поспех прэм'еры падзялілі і тыя ўдзельнікі тэатра-студыі, якія непасрэдна ў спектаклі роляў не выконвалі, але без каго ён не адбыўся б: яго тэхнічнае забеспячэнне было ў руках Уладзіміра Аніськова, Андрэя Скакуна, Наталлі Корхавай, Вольгі Чырык, Васіля Навуменкі, Наталлі Серыкавай.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: сцэна са спектакля.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## НА РАДЗІМЕ ПІСЬМЕННІКА-ЗЕМЛЯКА

Кожны год студэнты філалагічнага факультэта па цудоўнай старой традыцыі наведваюць радзіму народнага пісьменніка Беларусі І.П.Мележа. І сёлета, у адзін з сонечных дзён, студэнты-трэцякурснікі разам з выкладчыцай С.В.Чайковай пабывалі ў Хойніцкім раёне, дзе ашчадна захоўваецца памяць аб славутым земляку. Адбылася цікавая і карысная экскурсія дзякуючы намаганням пляменніцы пісьменніка, ст. выкладчыцы кафедры беларускай літаратуры Веры Савельеўны Генаш.

Студэнты-філолагі ўвачавідкі сустрэліся з мясцінамі, ужо знаёмымі ім па раману І.П.Мележа "Людзі на балоце". Будучых настаўнікаў сустрэлі шчырыя і добразычлівыя палешукі, якія з вялікай ахвотай апавядалі пра знакамітага аднавяскоўца. Мы наведалі дом-музей І.П.Мележа, вёску Куранёўка, прататып тых самых Куранёў, мясцовую школу, вучні і настаўнікі якой дбаюць пра захаванне светлага імя беларускага пісьменніка.

Застаецца толькі пажадаць, каб такія традыцыі працягваліся.

**А.ПРЫМАЧЭНКА,**
**студэнтка III курса беларускага аддзялення філалагічнага факультэта.**



**Наши ровесники -- за рубежом**

# КАК УЧИТСЯ И ОТДЫХАЕТ АМЕРИКАНСКИЙ СТУДЕНТ

***Сегодня мы предлагаем читателям газеты рассказ о студенческих годах американской молодёжи. Его прислала нам Милана Пинская. В 1995 г. она закончила с золотой медалью СШ N10, поступила в Минский государственный лингвистический университет. В том же году, как финалистка программы школьных обменов "Акт в поддержку свободы", уехала учиться в США. Имеет аттестат с отличием американской средней школы. По результатам выпускных экзаменов ей была предложена стипендия для продолжения учёбы в университете "Чэпмэн" штата Калифорния. Изучает международный бизнес.***

Студенчество -- лучшие годы нашей жизни. Меня часто спрашивают, как эти лучшие годы проводит американская студенческая братия. Казалось, что написать об этом мне не составит никакого труда, но всё обстоит гораздо сложнее. О студенческой жизни в США можно писать целые книги. Вкратце же я решила изложить это небольшими частями.

Начну с учебы. Самой большой разницей я считаю то, что в американских университетах такое понятие как группа абсолютно отсутствует. Обычно программы всех университетов рассчитаны на 4 года. Студенты каждого года обучения имеют свои "имена": I курс -- "свеженькие", II -- "более мягкие", III -- "младшие", IV -- "старшие". Причём , переход с одного курса на другой не происходит автоматически после одного года, а определяется числом курсов, которые студент прослушал. Таким образом, одни заканчивают университет за 5 лет, другие -- за 3,5 года. Как только ты выбрал специальность, тебе выдаётся список предметов, которые ты должен изучить. Причём, предоставляется полная свобода выбора, какие классы когда брать. Каждый студент составляет индивидуальное расписание. Кроме специализированных предметов каждый студент должен изучить такие предметы как искусство, физика, биология, иностранные языки, компьютеры, математика. В классах студент проводит всего несколько часов в день, но за домашними заданиями приходится проводить времени в 2-3 раза больше. Таким образом, на учёбу его уходит очень много.

Кроме учёбы многие студенты работают. Практически вся молодёжь начинает самостоятельную жизнь в 18-19 лет. Поэтому вместо того, чтобы "сидеть у родителей на шее", им приходится зарабатывать самим себе на жизнь. Это довольно нелегко -- найти хорошо оплачиваемую работу, когда ты так занят учёбой. $6-9 в час считается средняя зарплата для студентов. Обычно они работают по 20-25 часов в неделю. Летом во время каникул многие студенты проходят "добровольную" практику в компаниях по будущей специальности. Обычно студенты не получают за это деньги, но просто набираются полезного опыта. Зачастую опыт стоит дороже денег. Вот так, "всё в трудах" и проходит неделя студента. Но затем наступает "святое время". "В пятницу вечером" -- как пароль у американской молодёжи. В пятницу вечером все учебники забрасываются в угол и начинаются массовые развлечения. В пятницу вечером устраиваются самые крутые вечеринки. Одно из любимых мест, где тусуется молодёжь -- Лос-Анжелес. Сюда съезжаются люди со всей южной Калифорнии -- идут в многочисленные клубы, на концерты. На шоссе в пятницу вечером светло как днём от фар непрерывного потока автомобилей. Народ гуляет всю ночь! Среди любимых развлечений молодёжи в южной Калифорнии -- знаменитый зоопарк Сан Диего, пляжи, роликовые прогулки в Санта Монику, катание на лодках, поездки в Диснейленд. Лос-Анжелес предлагает несметное множество концертов. Ещё один вариант -- поехать в Голливуд, где всегда раздают бесплатные билеты на съёмки того или иного шоу. Зимой многие ездят в горы кататься на лыжах. Лас Вегас -- вот ещё одно место, где всегда полно студенческой братии. Новейшая достопримечательность тут -- отель и казино "Нью-Йорк, Нью-Йорк". В центре Лас Вегаса стоят копии самых знаменитых небоскрёбов Нью-Йорка в натуральную величину...

Да, повсюду -- множество соблазнов и развлечений, но для многих студентов это всё проекты на будущее, когда они наконец-то закончат учёбу и найдут настоящую работу. А пока -- лучшая и самая беззаботная пора жизни -- студенческие годы.

**Милана ПИНСКАЯ.**

**Продолжение -- о том, как поступить в американский университет прямо с белорусской школы.**

МАСТАЦТВА З ЯПОНІІ

Вялікую цікавасць у гамяльчан выклікала выстаўка японскіх лялек, якая працавала ў нашым горадзе. Такое нацыянальнае каларытнае мастацтва з краіны ўзыходзячага сонца дэманстравалася ў Беларусі ўпершыню, таму жадаючых пазнаёміцца з ім было нямала.



На выстаўцы былі сабраны маленькія ўзоры розных прадстаўнікоў японскага народа – ад старажытных мужных воінаў са зброяй у руках да прыгожых, вытанчаных прынцэс.



Лялькі выраблены ўмелымі рукамі японскіх майстроў са звычайных матэрыялаў -- дрэва і паперы, тканіны і гліны, а ў выніку кожны экспанат атрымаўся па-свойму арыгінальным і прывабным.

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ

У Гомелі прайшоў VII міждзяржаўны лёгкаатлетычны прабег "Званы Чарнобыля", у якім прыняло ўдзел больш за 100 бегуноў з Расіі, Украіны і Беларусі.

У бегу на 5 км увесь п'едэстал гонару занялі студэнты факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта: Леанід Бераснёў, Аляксей Кашаедаў і Аляксандр Іваноўскі.

Выкладчык кафедры фізвыхавання майстар спорту Валянцін Ткачоў заваяваў сярэбраную ўзнагароду ў бегу на 21 км.

◆◆◆

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па плаванню ў праграме студэнцкай спартакіяды. Нашы студэнты ў камандным заліку аказаліся другімі, уступіўшы першынство плыўцам Акадэміі фізічнай культуры і спорту.

Трэцякурснік факультэта фізічнай культуры Ігар Карніенка заваяваў дзве залатыя ўзнагароды на дыстанцыях 400 м вольным стылем і ў комплексным плаванні. На рахунку нашай каманды, якую трэніруе старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Б.Гіль, ёсць сярэбраныя і бронзавыя ўзнагароды.

◆◆◆

Па праграме студэнцкай спартакіяды ў сталіцы Беларусі адбыліся спаборніцтвы па дзюдо. У камандным заліку студэнты ГДУ заваявалі ганаровае трэцяе месца, што з"яўляецца вялікім поспехам. Мацнейшымі за нашых спартсменаў, якіх трэніруе старшы трэнер Гомельскай вобласці В.Унучкін, былі толькі студэнты Акадэміі фізічнай культуры і спорту і недзяржаўнага эканамічнага універсітэта.

◆◆◆

Завяршыўся чэмпіянат Беларусі па ручному мячу сярод жаночых каманд. Вышэйшыя ўзнагароды дасталіся мінскаму "Політэхніку", сярэбраныя -- камандзе "Політэхнік -- РШВСМ". У нашых гандбалістак (трэнер В.Крукоўскі) зноў "бронза".

**В.МАРЧАНКА,**
**наш спартыўны аглядальнік.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

Аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
- -- алгебры і геаметрыі -- прафесара;
- -- ВМ і праграміравання -- дацэнта;
- -- камерцыйнай дзейнасці і фінансаў -- заг. кафедры;
- -- бухгалтарскага уліку, кантролю і АГД -- асістэнта;
- -- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 226699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## СЕМЯНЧУК Яўген Антонавіч



Толькі чатыры дні не дажыў да свайго 73-годдзя кандыдат гістарычных навук дацэнт Яўген Антонавіч Семянчук. Нечакана яго сэрца перастала біцца 30 красавіка 1997 года.

Я.А.Семянчук нарадзіўся ў шматдзетнай сялянскай сям'і ў в.Пархшчаха Глускага раёна былой Палескай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён быў актыўным удзельнікам партызанскага руху. За сувязі з партызанамі ў 1943г. яго бацькі былі спалены гітлераўскімі акупантамі.

Радзіма высока ацаніла баявыя заслугі Яўгена Антонавіча. Ён удастоены 2 ордэнаў і 13 медалёў, двойчы прымаў удзел у парадах Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве.

У 1948 г. Я.А.Семянчук закончыў Белдзяржуніверсітэт. 3 красавіка наступнага года амаль усё яго працоўнае жыццё і заслужаны адпачынак на пенсіі былі звязаны з нашым горадам. Два з паловай гады ён працаваў інструктарам палітаддзела Беларускай чыгункі. Затым перайшоў у Гомельскі педагагічны інстытут імя В.Чкалава на пасаду старшага выкладчыка кафедры "Асновы марксізму-ленінізму".

У 1960 годзе Я.А.Семянчук паспяхова закончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС і абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

Пасля вучобы ў Маскве і вяртання ў Гомель Я.А.Семянчук працаваў дэканам філалагічнага факультэта, загадчыкам кафедры, дацэнтам спачатку ў пединстытуце, а затым у дзяржуніверсітэце. За працоўныя дасягненні і актыўную грамадскую дзейнасць ён двойчы узнагароджваўся Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, яму было прысвоена званне "Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі".

Яўген Антонавіч Семянчук карыстаўся павагай і вялікім аўтарытэтам сярод калег, студэнтаў, шырокай грамадскасці. Светлая памяць аб ім надоўга захаваецца ў сэрцах тых, з кім ён сумесна працаваў, каму шчодра перадаваў свае багатыя веды і вопыт, хто яго добра ведаў.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

Рэктарат, Савет ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, увесь калектыў універсітэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці кандыдата гістарычных навук дацэнта **СЕМЕНЧУКА Яўгена Антонавіча** і выказваюць сваё спачуванне сям'і і родным памёршага.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 165.
Падпісана да друку 13.05.97.